# Научная жизнь

# Навуковае жыццё

# Scientific events

## ТРЕТЬИ НАУЧНЫЕ ЧТЕНИЯ ПАМЯТИ ПРОФЕССОРА ВАЛЕНТИНА НАУМОВИЧА РЯБЦЕВИЧА

## ТРЭЦІЯ НАВУКОВЫЯ ЧЫТАННІ ПАМЯЦІ ПРАФЕСАРА ВАЛЯНЦІНА НАВУМАВІЧА РАБЦЭВІЧА

## THE THIRD SCIENTIFIC READINGS IN MEMORY OF PROFESSOR V. N. RABTSEVICH

Традыцыя правядзення міжнародных нумізматычных канферэнцый на гістарычным факультэце БДУ нарадзілася ў 2010 г., калі ў памяць аб заснавальніку беларускай навуковай нумізматыкі В. Н. Рабцэвічу і да адкрыцця новай экспазіцыі нумізматычнага кабінета былі праведзены навуковыя чытанні[1]. У іх прынялі ўдзел 42 даследчыкі з Беларусі, Літвы, Польшчы, Расіі і Славакіі. Паспяховае правядзенне канферэнцыі стала падставай для пераўтварэння чытанняў у перыядычную канферэнцыю, што арганізуецца раз на чатыры гады. Другія чытанні, удзельнікамі якіх сталі ўжо 52 навукоўцы з Беларусі, Латвіі, Літвы, Расіі і Украіны, адбыліся ў 2014 г.

Трэція навуковыя чытанні памяці прафесара БДУ Валянціна Навумавіча Рабцэвіча праводзіліся 16–18 мая 2018 г. У іх прынялі ўдзел 66 даследчыкаў, у тым ліку 40 прадстаўнікоў замежных краін – Кыргызстана, Літвы, Малдовы, Польшчы, Расіі, Чэхіі, Швецыі і Украіны.

Удзельнікамі канферэнцыі была разгледжана самая разнастайная тэматыка. Значная частка паведамленняў так ці інакш тычылася навуковай спадчыны В. Н. Рабцэвіча. Непасрэдна асобе вучонага быў прысвечаны даклад І. Н. Колабавай, якая распавяла пра эпісталярную спадчыну выбітнага нумізмата, у прыватнасці пра яго перапіску з калегамі і настаўнікамі з Ленінграда: І. Г. Спаскім, І. Г. Дабравольскім і М. Б. Северавай.

Антычная нумізматыка была прадстаўлена шэрагам паведамленняў. Я. В. Захараў (Дзяржаўны гістарычны музей, Расія) распавёў пра блізкаўсходнія надчаканкі на электравых манетах VI–IV стст. да н. э. і пераканаўча абгрунтаваў існаванне на Блізкім Усходзе традыцыі абарачэння вагавога каштоўнага металу ў разнастайных формах, у тым ліку і ў выглядзе манет. Сучасны стан і перспектывы дыгіталізацыі антычнай нумізматыкі ва Усходняй Еўропе былі разгледжаны К. В. Мызгіным (Варшаўскі ўніверсітэт, Польшча). Аўтарскі калектыў на чале з доктарам хабілітаваным Я. Бодзэкам (Ягелонскі ўніверсітэт, Польшча) пазнаёміў удзельнікаў канферэнцыі з праектам «Знаходкі рымскіх манет з Польшчы і тэрыторый, гістарычна звязаных з Польшчай» і з яго рэалізацыяй у гістарычным рэгіёне Малапольшча. Нарэшце, некалькі паведамленняў было прысвечана знаходкам рымскіх манет на тэрыторыі Беларусі і Украіны.

Наступны блок дакладаў датычыўся пытанняў нумізматыкі ранняга Сярэднявечча. Аб скарбах арабскіх дзірхамаў з Гнёздава і Пінска распавялі А. А. Шаўцоў (Дзяржаўны гістарычны музей, Расія) і В. С. Куляшоў (Стакгольмскі ўніверсітэт, Швецыя). Знаходкам арабскіх і заходнееўрапейскіх манет

[1] *Сидорович В. М., Плавинский А. Н.* Международные научные чтения памяти профессора БГУ В. Н. Рябцевича // Российские и славянские исследования. 2010. Вып. 5. С. 398–400.

у курганах Цэнтральнай Беларусі прысвяціў сваё паведамленне А. В. Вайцяховіч (Інстытут гісторыі НАН Беларусі). Праблема масавага з'яўлення антыкварных падробак старажытнарускіх срэбранікаў была разгледжана М. С. Маісеенкам (Расія). Гэтым жа аўтарам разам з С. У. Хаўрыным (Дзяржаўны Эрмітаж, Расія) былі абвешчаны вынікі даследавання сярэднявечных срэбраных плацёжных зліткаў метадам рэнтгенафлюарэсцэнтнага аналізу.

Традыцыйна самай актуальнай для беларускіх нумізматычных канферэнцый тэмай, якая выклікае гарачыя дыскусіі і спрэчкі, застаецца чаканка манет у Вялікім Княстве Літоўскім і на прылеглых тэрыторыях у XIV–XV стст. Не сталі выключэннем і Трэція навуковыя чытанні памяці прафесара БДУ Валянціна Навумавіча Рабцэвіча. На секцыі «Грашовае абарачэнне ў XIV–XVI стст.» прагучалі даклады ўкраінскага даследчыка У. Г. Шапашніка аб манетах удзельных северскіх княстваў, якія імітавалі залатаардынскую чаканку, і студэнта Санкт-Пецярбургскага дзяржаўнага ўніверсітэта У. А. Волкава аб смаленскіх манетах з выявай «Калюмнаў». Найбольшую зацікаўленасць і працяглае абмеркаванне выклікаў даклад Ю. Л. Барэйшы (Беларусь) аб храналогіі эмісій манет Ягайлы і семантыцы выяў на іх. Дакладчыку ўдалося пераканаўча абгрунтаваць дакладнае датаванне некаторых тыпаў манет.

Некалькі паведамленняў было прысвечана новым знаходкам ранніх манет Вялікага Княства Літоўскага на яго былых тэрыторыях, у тым ліку на сучасных Маладзечаншчыне і Смаленшчыне. Самым цікавым з гэтага шэрагу стала паведамленне Я. В. Уласаўца аб нумізматычных знаходках з магільніка XIV–XVI стст. каля в. Грынцы Ашмянскага раёна.

Росквіт манетнага абарачэння на нашых землях прыпадае на XVI–XVII стст. Натуральна, што гэты час не застаўся па-за ўвагай удзельнікаў канферэнцыі. Аднаму з тыпаў смаленскіх манет першай паловы XVI ст. было прысвечана паведамленне В. В. Зайцава (Дзяржаўны гістарычны музей, Расія). Новыя даныя аб пачатку абарачэння ў ВКЛ талернай манеты прагучалі ў дакладзе У. А. Юргенсона (Інстытут гісторыі НАН Беларусі). Аб некалькіх скарбах з тэрыторыі Беларусі паведамілі беларускія навукоўцы Л. І. Таўкачова, Р. І. Крыцук, В. А. Кабрынец і А. М. Плавінскі, а таксама расійская даследчыца Н. У. Чакуніна, якая распавяла пра паступленне ў Цвярскі музей у 1910 г. часткі манетнага скарбу з мястэчка Крычаў Магілёўскай губерні.

Два даклады датычылі тэмы знешнегандлёвых сувязей, пра што сярод іншага сведчаць знаходкі замежных манет. Так, знаходкам літоўскіх і польскіх манет на тэрыторыі Цвярскога краю прысвяціў сваё паведамленне расійскі археолаг У. У. Хухараў. У сваю чаргу, аб знаходках манет валашскага гаспадара Міхая Раду на тэрыторыі Беларусі распавёў Р. І. Крыцук (Нацыянальны гістарычны музей, Беларусь).

Асобна варта адзначыць выступленне В. А. Кабрынца (Музей Беларускага Палесся, Беларусь) і М. В. Клімава (Інстытут гісторыі НАН Беларусі), якія разгледзелі падзеі Інфлянцкай (Лівонскай) вайны на падставе нумізматычных знаходак. Раскопкі шэрагу фартэцый Рускага царства на Полаччыне далі прадстаўнічую калекцыю манет, сярод якіх абсалютна пераважаюць розныя наміналы Маскоўскай дзяржавы.

Асобная секцыя на Трэціх навуковых чытаннях была прысвечана тэме падробкі грошай у розныя гістарычныя эпохі. Гэта пасяджэнне адбылося ў сценах Нацыянальнага гістарычнага музея Рэспублікі Беларусь, які выступіў партнёрам БДУ ў справе арганізацыі сёлетніх чытанняў. Спецыяльна да канферэнцыі Нацыянальным гістарычным музеем Рэспублікі Беларусь, які валодае найвялікшай у краіне нумізматычнай калекцыяй, была зладжана выстава «Зладзейскія грошы, або Гісторыя фальшываманецтва». Выстава, у падрыхтоўцы якой прынялі ўдзел шэраг музеяў, у тым ліку музей гістарычнага факультэта БДУ, музей крыміналістыкі пры Акадэміі МУС Рэспублікі Беларусь, музей цэнтра культурна-выхаваўчай работы МУС Рэспублікі Беларусь, мела мэтай паказаць гісторыю і матэрыяльныя сведчанні аднаго з самых старажытных і распаўсюджаных злачынстваў – падробкі плацёжных сродкаў.

Выступленні на секцыі «Фальшываманецтва» ахапілі шырокі храналагічны дыяпазон – ад X да XX ст. Сярод дакладаў варта адзначыць паведамленне А. М. Камышава (Кыргызстан) аб фальшываманецтве ў Чагатайскім улусе, М. Возьняка (Музей імя Э. Гутэн-Чапскага, Польшча) аб фальшывых манетах Ягелонаў у калекцыі Нацыянальнага музея ў Кракаве і У. І. Галанава (Смаленскі дзяржаўны музей-запаведнік, Расія) аб фальшываманетчыках у Смаленскай губерні Расійскай імперыі. Асаблівую зацікаўленасць удзельнікаў канферэнцыі выклікала паведамленне А. С. Бойка-Гагарына (Нацыянальны музей гісторыі Украіны) і В. Рузаса (Музей грошай Банка Літвы) аб унікальнай падробцы меднай капейкі Рускага царства.

Нумізматычныя канферэнцыі традыцыйна з'яўляюцца месцам абмеркавання актуальных праблем сумежных гістарычных дысцыплін – сфрагістыкі, геральдыкі і фалерыстыкі. Не сталі выключэннем і Трэція навуковыя чытанні памяці прафесара БДУ Валянціна Навумавіча Рабцэвіча, на якіх дзейнічала асобная секцыя па гэтых дысцыплінах. Найбольшая ўвага была нададзена пытанням сфрагістыкі. Беларускія даследчыкі В. І. Кошман і М. А. Плавінскі распавялі аб распачатай працы па каталагізацыі знаходак «драгічынскіх» пломб у Мінску і яго ваколіцах. Шэраг дакладаў быў прысвечаны новым знаходкам віслых пячатак на тэрыторыі

Полацкай зямлі і ў іншых рэгіёнах. Так, І. А. Жукаў (Расія) паведаміў пра пячаткі віцебскай княгіні Сафіі, а І. М. Шталянкоў (Беларусь) – пра выяўленне вялікай колькасці пячатак у Аршанскім раёне. Гісторыя сфрагістычнай калекцыі Нацыянальнага музея Літвы была асветлена ў выступленні В. Алексеюнаса (Літва).

Два выступленні былі прысвечаны геральдыцы. Так, С. М. Цемушаў (Беларусь) выказаў сваё меркаванне аб прызначэнні так званых «геральдычных» падвесак, якія былі распаўсюджаны на землях Старажытнай Русі ў X–XI стст. Аб сучасным стане і перспектывах развіцця тэрытарыяльнай геральдыкі Беларусі распавяла М. М. Елінская (Дэпартамент па архівах і справаводстве Міністэрства юстыцыі Рэспублікі Беларусь).

Пра вельмі цікавую для беларускай фалерыстыкі знаходку ў Асобым архіве Літвы паведаміла Д. Грымалаўскайтэ (Нацыянальны музей Літвы). Там захоўваецца ўнікальны крыж Заслугі – узнагарода Беларускай цэнтральнай рады для настаўнікаў Віленскай беларускай гімназіі.

Такім чынам, можна канстатаваць, што Трэція навуковыя чытанні памяці прафесара БДУ Валянціна Навумавіча Рабцэвіча прайшлі на высокім прафесійным узроўні. Шырокае геаграфічнае прадстаўніцтва ўдзельнікаў, разнастайная тэматыка і навуковая значнасць іх паведамленняў, а таксама вострыя дыскусіі падчас пасяджэнняў набліжаюць канферэнцыі гістарычнага факультэта БДУ да самых прэстыжных нумізматычных навуковых форумаў Цэнтральнай і Усходняй Еўропы. Мы маем усе падставы меркаваць, што наступныя чытанні памяці Валянціна Навумавіча Рабцэвіча, правядзенне якіх запланавана на 2022 г., будуць яшчэ больш цікавымі і прадстаўнічымі.

***В. М. Сідаровіч***[2]

## КРУГЛЫЙ СТОЛ «ОТ УРБАНИСТИКИ ДО ВООРУЖЕНИЯ ВЕЛИКОГО КНЯЖЕСТВА ЛИТОВСКОГО»

## КРУГЛЫ СТОЛ «АД УРБАНІСТЫКІ ДА ЎЗБРАЕННЯ ВЯЛІКАГА КНЯСТВА ЛІТОЎСКАГА»

## ROUND TABLE «FROM URBAN STUDIES TO THE ARMING OF THE GRAND DUCHY OF LITHUANIA»

Чалавек у праяўленні індывідуальнай і калектыўнай памяці імкнецца да абсалютызацыі знакавых падзей і дат, абагульняе іх у эмацыйна значныя ўспаміны і ідэнтычнасці. Карпаратыўная ж памяць аперыруе знакавасцю асобы і фарміраваннем мадэляў паводзін унутры гэтай карпарацыі. Універсітэт – гэта супольнасць вучняў і настаўнікаў, павага да асобы Мэтра і выхаванне новай генерацыі.

У аўдыторыі імя Уладзіміра Іванавіча Пічэты гістарычнага факультэта Беларускага дзяржаўнага ўніверсітэта 12 красавіка 2018 г. на круглым стале «Ад урбаністыкі да ўзбраення Вялікага Княства Літоўскага» калегі, вучні і студэнты ўшанавалі памяць сябра і настаўніка, даследчыка і калегі Юрыя Мікалаевіча Бохана, заўчасна памерлага 13 красавіка 2017 г.

Юрый Мікалаевіч нарадзіўся 21 лютага 1966 г. у Мінску. Скончыў Мінскі дзяржаўны педагагічны інстытут імя М. А. Горкага (цяпер – Беларускі дзяржаўны педагагічны ўніверсітэт імя М. Танка) і аспірантуру Інстытута гісторыі Нацыянальнай акадэміі навук Беларусі. Кандыдацкую дысертацыю па археалогіі абараніў у 1994 г. Доктарам гістарычных навук стаў у 37 год (2003 г.). Кіраваў аддзелам гісторыі Беларусі XIII–XVIII стст. у Інстытуце гісторыі НАН Беларусі і кафедрай эканамічнай гісторыі Беларускага дзяржаўнага эканамічнага ўніверсітэта. Сябра навуковых і экс-

[2]*Виталий Михайлович Сидорович* – заведующий учебной лабораторией музейного дела исторического факультета Белорусского государственного университета.

*Віталь Міхайлавіч Сідаровіч* – загадчык вучэбнай лабараторыі музейнай справы гістарычнага факультэта Беларускага дзяржаўнага ўніверсітэта.

*Vital M. Sidarovich*, the head of training laboratory of museum business, faculty of history, Belarusian State University.

E-mail: *wital.sidarowicz@gmail.com*